# "ЛЕСВІЦА ПОСПЕХУ" Ў АДУКАЦЫЙНЫМ ПРАЦЭСЕ ЎСТАНОЎ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

*Карпенка Ірына Аляксееўна*

***Анатацыя.*** *У артыкуле прадстаўлены элементы арганізацыі адукацыйнага працэсу ў сістэме дашкольнай адукацыі, якія ствараюць "лесвіцу поспеху" ў развіцці дзіцяці. Разглядаецца педагагічны вопыт аўтара, апісваюцца асноўныя кірункі дзейнасці педагагічных работнікаў устаноў дашкольнай адукацыі, накіраваныя на патрыятычнае выхаванне, далучэнне да інфармацыйных тэхналогій, ажыццяўленне пераемнасці паміж дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыяй.*

Адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь арыентавана на навучанне і выхаванне ў інтарэсах чалавека, грамадства, дзяржавы, накіравана на фарміраванне гарманічнай і рознабакова развітай асобы. Дзяржаўная палітыка ў сферы адукацыі грунтуецца на ўмацаванні вядучых прынцыпаў развіцця нацыянальнай школы, сярод якіх: дзяржаўна-грамадскі характар кіравання; забеспячэнне прынцыпу справядлівасці, роўнага доступу да адукацыі; павышэнне якасці адукацыі для кожнага. У Рэспубліцы Беларусь на высокім узроўні развіта сістэма дашкольнай адукацыі. І хоць у XXI стагоддзі дашкольная адукацыя не з'яўляецца абавязковай, большасць дзяцей, перш чым пайсці ў школу, наведваюць установы дашкольнай адукацыі.

На сучасным этапе развіцця грамадства, калі ў яго жыцці адбываюцца значныя змены, актуалізуецца праблема выхавання маленькага грамадзяніна і патрыёта сваёй краіны. Патрыятычнае выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту — гэта складаны педагагічны працэс, у аснове якога ляжыць развіццё маральных каштоўнасцей.

Дашкольнае дзяцінства — спрыяльны перыяд для далучэння дзіцяці да нацыянальнай культуры. Таму вельмі важна пачынаць выхоўваць сапраўднага патрыёта сваёй Радзімы менавіта ў гэтым узросце, калі дзіця пачынае інтэнсіўна развівацца ў сацыяльным плане. Мэтанакіраваная праца па фарміраванні любові да роднага горада, краю, культуры і традыцый спрыяюць развіццю асобы, фарміраванню патрыятызму, таму задача сістэмы дашкольнай адукацыі — навучыць дзяцей любіць свой горад, свой родны край, спазнаваць яго, паважаць традыцыі, памятаць яго гісторыю.

Вучэбная праграма і адукацыйны стандарт дашкольнай адукацыі прадугледжваюць фарміраванне ўяўленняў выхаванцаў пра сваю малую радзіму, народныя і дзяржаўныя святы, пра сімвалы беларускай дзяржавы, Беларусь, славутасці роднага горада, вёскі, сталіцы, пра людзей, якія праславілі нашу Радзіму, Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, выхаванне ў дзяцей любові да роднай зямлі, развіццё імкнення глыбей спазнаць мову і прыроду Беларусі, свайго рэгіёну; фарміраванне ведаў аб культурна-гістарычным мінулым беларускага народа, а таксама пачуццё гонару і адказнасці перад сваёй Радзімай. Асаблівая ўвага надаецца выхаванню павагі і гонару за дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь.

Патрыятычнае выхаванне ва ўстанове дашкольнай адукацыі забяспечвае планамерную і паслядоўную перадачу гістарычнага і сацыяльнага вопыту беларускага народа, выхаванне павагі і гонару да дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь. Дашкольнае дзяцінства з'яўляецца адным з самых важных узроставых этапаў, бо менавіта ў гэтым узросце закладваюцца асновы асобы, запускаецца працэс сацыялізацыі, развіваюцца здольнасці дзіцяці. Адукацыя ў працэсе жыцця чалавека вельмі важны кампанент, які патрабуе намаганняў самога чалавека, якая ўяўляецца нам як своеасаблівая лесвіца поспеху, па якой кожны чалавек падымаецца і развіваецца ў працэсе жыцця.

Дашкольны ўзрост — гэта аснова ўсяго далейшага жыцця чалавека. Менавіта ў дашкольным узросце адбываецца інтэнсіўнае развіццё ўсіх самых лепшых якасцей асобы. Таму вельмі важна, каб педагог змог стварыць кожнаму дзіцяці "сітуацыю поспеху". Для педагога вельмі важна, каб выхаванцы былі актыўныя, жыццярадасныя, мэтанакіраваныя, адкрытыя, прымалі саміх сябе і іншых, з павагай ставіліся да сябе, сям'і, наваколля і сваёй краіны. Усё гэта і стварае аснову для грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

Паказаць у сістэме працы праз малое вялікае, выявіць залежнасць паміж дзейнасцю аднаго чалавека і жыццём усіх людзей важна для выхавання грамадзянска-патрыятычных пачуццяў. Таму важнай умовай выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту з'яўляецца цесная ўзаемасувязь з бацькамі. Дотык да гісторыі сваёй сям'і выклікае ў дзіцяці моцныя эмоцыі, прымушае суперажываць, уважліва ставіцца да памяці мінулага, да гістарычных каранёў. Узаемадзеянне з бацькамі спрыяе выхаванню беражлівых адносін да традыцый, захаванню сямейных сувязеў.

Далучэнне выхаванцаў да сучаснага свету інавацыйных тэхналогій  адбываецца праз выкананне новых праектаў, як, напрыклад:

*робататэхніка ва ўстанове дашкольнай адукацыі* — гэта крэатыўныя, варыятыўныя заняткі, у працэсе якіх дзіця ўзаемадзейнічае з адмысловым канструктарам, вывучае працу розных механізмаў, спрабуе стварыць уласныя мадэлі робатаў, выкарыстоўваючы схемы або прыдумляючы свае варыянты;

*інфарматыка без разеткі* — праект, накіраваны на развіццё лагічнага мыслення і фарміраванне алгарытмічных уменняў без выкарыстання камп'ютара ў дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту (праект рэалізуецца Паркам высокіх тэхналогій пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь);

*вывучэнне замежных моў* павышае якасць моўнай падрыхтоўкі, якая з'яўляецца адной з важных задач

фарміравання ўсебакова развітай асобы. Вывучэнне англійскай мовы ў дашкольным узросце аказвае ўплыў на інтэлектуальнае развіццё, паскарае моўнае развіццё, замацоўвае ўменні ўзаемадзеяння з настаўнікам, аднагодкамі і бацькамі; трэніруе ўніверсальныя пазнавальныя дзеянні і, што вельмі важна, рыхтуе да школы.

Новыя методыкі, праекты, тэхналогіі дазваляюць дзецям дашкольнага ўзросту самім ствараць інтэрактыўныя гульні, прымаць нестандартныя рашэнні, спрыяюць падрыхтоўцы да паступлення ў школу. Пераемнасць установы дашкольнай адукацыі і ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі прадугледжвае фарміраванне узроўню агульнага развіцця і выхаванасці, які адказвае патрабаванням школьнага навучання. Для паўнавартаснай і годнай перадачы выхаванцаў у школу педагогу дашкольнай адукацыі неабходна зрабіць упор на веды, уменні, навыкі і іх актыўнае выкарыстанне для далейшага ўсебаковага развіцця навучэнцаў [2]. Заканчэнне дашкольнага перыяду і паступленне ў школу — пераломны момант у жыцці дзіцяці. З яго пачынаецца новы этап у развіцці: трэба будзе асвойваць формы дзейнасці, непадобныя на ранейшыя, выпрацоўваць іншы стыль адносін з аднагодкамі і дарослымі, фізіялагічна перабудоўвацца. Таму важна, каб будучы вучань умеў мець зносіны з навакольнымі людзьмі, быў добразычлівым з іншымі дзецьмі, з дарослымі, у тым ліку педагогамі.

Школа пастаянна павышае патрабаванні да інтэлектуальнага развіцця дзіцяці. Гэта тлумачыцца наступнымі аб'ектыўнымі прычынамі: навукова-тэхнічны прагрэс; павелічэнне патоку інфармацыі; змены, якія адбываюцца ў нашым грамадстве; удасканаленне зместу і павышэнне значнасці адукацыі. Таму праца з дзецьмі дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту павінна зыходзіць з прынцыпу “не нашкодзь” і быць накіраванай на захаванне здароўя, эмацыйнай раўнавагі і развіццё індывідуальнасці кожнага дзіцяці. Пераемнасць дае магчымасць комплексна вырашаць пазнавальныя, выхаваўчыя і развіваючыя задачы.

Гарманічнае ажыццяўленне пераемнасці паміж сістэмамі адукацыі будзе спрыяць паўнавартаснаму развіццю асобы дзіцяці, фарміраванню сістэмы бесперапыннай адукацыі на працягу ўсяго жыцця. У выпадку, калі такія сувязі будуць фармальнымі, то добрага выніку дасягнуць не атрымаецца. Сярод галоўных складнікаў паняцця “гатоўнасць да школы” – развіццё дапытлівасці і пазнавальнай актыўнасці дзіцяці, уменні самастойна думаць і вырашаць найпростыя разумовыя задачы.

Для паспяховага ажыццяўлення пераемнасці прапануем наступныя формы работы: узаеманаведванне заняткаў, індывідуальныя гутаркі настаўнікаў і педагогаў дашкольнай установы з бацькамі і дзецьмі; правядзенне сумесных мерапрыемстваў; аналіз дзейнасці па ажыццяўленні пераемнасці ў дашкольнай установе і пачатковай школе.

Такім чынам, своеасаблівая “лесвіца поспеху”, прыступкі якой вядуць выхаванцаў па адукацыйным працэсе, наладжвае сувязі паміж педагагічнымі работнікамі і бацькамі, спрыяе выхаванню і развіццю дзіцяці, закладвае трывалыя асновы і выбудоўвае шлях да самастойных пошукаў і адкрыццяў на працягу ўсяго жыцця.

### Спіс літаратуры

1. Лира, Т.А. Речевое развитие дошкольников с использованием моделей / Т.А. Лира, Е.И. Мельник. — Мозырь : Содействие, 2011. — 87 с.

2. Старжинская, Н.С. Развитие речи и общения у детей дошкольного возраста: пособие для педагогов учреждений дошкольного образования/ Н.С. Старжинская, Д.Н. Дубинина. — Минск: Адукацыя і выхаванне, 2012. — 132 с.

*Дата поступления в редакцию: 01.11.2024*